**УДК 82:2-1(09)**

# СЭНСАВАЕ ПОЛЕ ПЫТАННЯ ІЕРАРХІІ Ў ПРАВАСЛАЎНА-КАТАЛІЦКАЙ ПАЛЕМІЦЫ XVII СТАГОДДЗЯ НА ПРЫКЛАДЗЕ ДЫСПУТУ ІАНІКІЯ ГАЛЯТОЎСКАГА І АДРЫЯНА ПІКАРСКАГА «ROZMOWA BIAŁOCERKIEWSKA»

***Д.А. СМАЛЯКОЎ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Апісваецца кола разнастайных канатацый, звязаных з абмеркаваннем царкоўнай іерархіі ў рэлігійнай палеміцы паміж каталіцтвам і праваслаўем у Беларусі XVII стагоддзя на прыкладзе палемікі Іанікія Галятоўскага і Адрыяна Пікарскага «Rozmowa Białocerkiewska». Падаюцца гістарычныя акалічнасці і падаплёка рэлігійных аргументаў кожнага з бакоў. Вывучаецца пытанне старшынства Папы Рымскага ў хрысціянскай супольнасці, як вузлавы момант рэлігійнай палемікі паміж каталіцтвам і праваслаўем на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. Апісваецца месца і значэнне пададзеных аргументаў для рэлігійнага і духоўнага жыцця Беларусі XVII стагоддзя. Вывучаецца месца рэлігійнай палеміцы ў дыялогу аб аб'яднанні хрысціянскіх цэркваў. На аснове пералічаных аргументаў фіксуюцца наступствы рэлігійнай палемікі для існавання праваслаўнай і каталіцкай канфесій у Беларусі.*

Пасля заключэння Брэсцкай уніі 1596 года, калі рымскі касцёл і большая частка праваслаўнай іерархіі тагачаснай Беларусі падпісалі экуменічны акт, адбыўся рэлігійны падзел унутры праваслаўнай іерархіі на беларускіх землях. Тая яе частка, што не згадзілася прызнаваць старшынство Папы Рымскага і пацвердзіла сваё дачыненне да візантыйскага патрыярхату вымушана была існаваць па-за законам [2, с. 417 – 418]. На пачатку XVII стагоддзя праваслаўная іерархія зноў атрымала магчымасці для аднаўлення і легальнага існавання [2, с. 431 – 458], тым не менш знаходзілася ў матэрыяльнай залежнасці ад праваслаўных брацтваў, якія частка кантралявалі не толькі дзейнасць прыхода, але і дзейнасць самога святара [7, с. 100]. З гэтага пункту гледжання пытанне рэлігійнай іерархіі выглядае надзённа ў палеміцы паміж праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі XVII стагоддзя.

Прымаючы пад увагу самастойнасць праваслаўна-каталіцкай палемікі, нельга забываць, што пытанне рэлігійнай іерархіі з'яўляецца гістарычным і традыцыйным у духоўным жыцці Беларусі канца XVI – XVII стагоддзі. Дадзеная тэма з'яўляецца адной з магістральных і для пратэстанцкай літаратуры, як прыклад шматстаронкавы твор «Апалогія: то значыць абарона навукі праўдзівай» (Apologia więtsza, to iest: obrona nauki prawdziwey) [4] Марціна Кравіцкага, выдадзеная ў Вільні ў 1606 годзе. У той жа час гэта тэма складанай палемікі паміж праваслаўнай і ўніяцкай канфесіямі, дзе праваслаўе цяжка адстойвала права на сваю ўласную іерархію і тут, безумоўна, адным з найбольш істотных твораў з'яўляецца «Верыфікацыя нявіннасці» (Verificatia niewinności) [5].

«Rozmowa Białocerkiewska» – палемічны твор XVII стагоддзя, вынік дыспуту паміж Мітрапалітам Чарнігаўскім Іанікіям Галятоўскім, і каталіцкім святаром Адрыянам Пікарскім, які адбыўся ў прысутнасці кароннага канцлера і шматлікага каталіцкага духавенства. Характэрнай асаблівасцю дадзенай працы з'ўляецца сталасць аргументацыі бакоў. Як І. Галятоўскі, так і А. Пікарскі абапіраюцца на доўгую гісторыю рэлігійнай аргументацыі і ў сцiслым выглядзе сваімі рэплікамі падводзяць своеасаблівы вынік 100-гадовай рэлігійнай палемікі паміж праваслаўнымі і каталікамі.

Істотным фактам звароту да дадзенай працы, як прыкладу, на якім можна разгледзець шырокі пласт духоўнага жыцця Беларусі XVII стагоддзя, таксама з'ўляецца малая вывучанасць дадзенай працы сярод сучаснай філасофскай і рэлігіязнаўчай супольнасці. Нягледзячы на тое, што «Rozmowa Białocerkiewska» з'ўляецца вядомым творам Іанікія Галятоўскага, які часта згадваецца ў бібліяграфіях рэлігійнай палемікі Беларусі XVII стагоддзя, праз рэдкасць выдання і адсутнасці позніх перадрукаў заставаўся да гэтага часу малавывучаным. Між тым дыспут мае выключнае значэнне для аналізу тагачаснага духоўнага жыцця, так як утрымлівае ўсе лепшыя напрацоўкі каталіцкага і праваслаўнага боку за 100 год палемічнай актыўнасці на тэрыторыі Беларусі. Менавіта таму ён можа служыць выключным прыкладам гісторыі ўзаемадачынення двух канфесій.

Іанікій Галятоўскі (1620 – 1688) – вядомы праваслаўны палеміст, атрымаў адукацыю ў Кіева-Магілянскім калегіуме, палемізаваў з каталіцтвам, яўрэйствам, мусульманствам [8, с. 551 – 554]. Часта выкарыстоўваў форму дыялогу для выкладання сваіх твораў.

Адрыян Пікарскі (1615 – 1679) з'ўляўся вайсковым капеланам Стэфана Чарнецкага, таксама сакратаром караля Яна Казіміра, а таксама Міхала Карыбута Вішнявецкага і Яна III Сабескага. Скончыў калегіум у Калішы, потым выкладаў [1, с. 106 – 107]. Прыняў удзел у шэрагу войнаў у якасці вайсковага капелана, але асабліва запомнілася яго палеміка ў Белай Царкве з Іанікіям Галятоўскім, якая была запісана і надрукавана асобным творам.

«Rozmowa Białocerkiewska» была выдадзена ў 1663 годзе, гатычным шрыфтам у якасці дадатку да "Скарбніцы потребной" [6], буйнага твора Іанікія Галятоўскага, прысвечанага цудам Елецкай Божай Маці. Кніга ўбачыла свет на афіцыйнай мове (польскай[1], на якой і адбываўся дыспут у Белай царкве) і з'яўляецца адным з характэрных твораў праваслаўна-каталіцкай палемікі Беларусі XVII стагоддзя.

Сачыненне пабудавана ў выглядзе дыялогу, дзе кожная рэпліка з'яўляецца аргументам, а наступная контраргументам. Нягледзячы на тое, што аўтарства працы належыць І. Галятоўскаму, твор пабудаваны як аб'ектыўнае спавешчанне з дыспуту. Размова паступова разгортваецца ад разбору тэалагічнага пытання спадчыннасці ўлады ў хрысціянскай супольнасці, і заканчаецца разглядам паглядаў на ўладкаванне царквы, дзяржавы і магчымасці аб'яднання паміж рознымі хрысціянскімі супольнасцямі. Магістральны напрамак дыспуту пралягае праз абмеркаванне кампетэнцыі Папы Рымскага і ўладкавання царкоўнай іерархіі. У сваю чаргу, ускосныя тэмы зачапляюць шматлікія тэалагічныя, сацыяльныя і духоўныя пытанні тагачаснага жыцця.

Палеміка вакол старшынства Папы Рымскага фіксуецца на пытанні магчымасці старшынства сярод патрыярхаў. Ці можа адзін з патрыярхаў быць главой над астатнімі? У сваю чаргу, пытанне старшынства сярод патрыярхаў наследуе пытанне старшынства між апосталамі. Ці можа адзін апостал старшынстваваць над іншымі?

Бакі прапаноўваюць два раўнапраўныя аргументы: А. Пікарскі заяўляе, што "калі трон папы роўны тронам патрыярхаў, як тады ён мог прызначаць іх і здымаць" [3, с. 2]. Пікарскі фіксуе вектар адзінага пачатку, іншымі словамі, калі ёсць пэўная структура, то павінен быць яе кіраўнік, які санкцыянуе кампетэнцыі. Контраргумент Галятоўскага палягае ў тым, што не сам Папа Рымскі прызначаў і здымаў патрыярхаў, але склікаў сінод: "Не сам рабіў то, як уладар, які мае суадносныя паўнамоцтвы, але склікаў сход" [3, с. 2]. Вектар праваслаўнага духавенства скіраваны на калектыўнае прыняцце кампетэнцыі, «саборнасць».

У дзвюх пазначаных пазіцыях выяўлены асноўны напрамак развіцця палемікі: каталіцкі падыход цэнтралізацыі і іерархізацыі, і праваслаўны – дэцэнтралізацыі і раўнапраўнасці (калектыўнасці). Так, А. Пікарскі ўпікае І. Галятоўскага, што Папа старшынстваваў на высокіх сінодах, на што І. Галятоўскі заўважаў, што старшынстваваў не з нагоды царкоўнага старшынства, але з нагоды старшынства Рымскай сталіцы, якая потым была перанесена ў Канстанцінопаль і права старшынства было перададзена туды. Іншымі словамі, любыя канатацыі, звязаныя з надзяленнем асаблівай кампетэнцыяй асобнага чалавека на гэтым свеце, з'яўляюцца выключна фармальнымі. У сваю чаргу, такія фармальныя характарыстыкі могуць дэнансавацца, альбо пераходзіць да іншых людзей. З пункту гледжання праваслаўя канстантныя духоўныя пазіцыі сыходзяць выключна з іншага свету, усё астатняе з'яўляецца палемічным.

З іншага боку, пытанне фармальнасці ў разрэзе праваслаўна-каталіцкай палемікі застаюцца не такімі простымі. Як сцвярджае А. Пікарскі, улада Пятра была дадзена не ад царквы, а непасрэдна ад Хрыста: "Да Пятра мовіць: і ты некалі навярнаны сцвярджай братоў сваіх. Таму і папе не ад царквы, але ад Хрыста праз Пятра Святога дадзена старшынство і першае месца на сінодах" [3, с. 3]. Іншымі словамі, кампетэнцыі пантыфіка таксама сыходзяць непасрэдна з іншага свету.

Між тым падыход А. Пікарскага застаецца фармальным, бо І. Галятоўскі ў якасці контраргумента звяртаецца ў першую чаргу да духоўнага досведу, а не да пошуку іерархічных кампетэнцый у словах Хрыста. Так, адказваючы на закід А. Пікарскага, І. Галятоўскі ў іншым рэчышчы інтэрпрэтуе словы Хрыста, а менавіта знаходзіць не іерархічныя кампетэнцыі, але асаблівыя стасункі з Богам: "Людзей верных сцвердзіць у міласэрнасці Боскім, каб упаўшы ў які грэх, не распачалі енк аб міласэрнасці Божым, але каб да Бога навярталі, так за грэх свой папакутваючы, той ім грэх дараваны будзе" [3, с. 3]. Іншымі словамі, любыя кампетэнцыі, атрыманыя ад Бога, ёсць кампетэнцыі ўнутранага духоўнага жыцця, якія ў першую чаргу звязваюць дачыненні чалавека і Бога, а не сцвярджаюць месца гэтага чалавека сярод іншых людзей.

Варта зрабіць істотную заўвагу, пытанне разыходжання асноўных хрысціянскіх пастулатаў у дадзенай палеміцы адсутнічае. Палеміка разгортваецца вакол інтэрпрэтацыі пастулатаў, пры гэтым пытанне інтэрпрэтацыі апынаецца фармоўшчыкам светапогляду сяброў канфесій. Адбываецца змяшчэнне зместу веры ад пастулатаў да інтэрпрэтацыі. Так, і Галятоўскі, і Пікарскі прызнаюць старшынство Хрыста над хрысціянскай супольнасцю і прымаюць яго за цара нябеснага, у той час як пытанне намесніка Хрыста на зямлі застаецца палемічным. Адрыян Пікарскі цытуе Хрыста для фіксацыі месца Святога Пятра ў новапаўсталай рэлігійнай арганізацыі, хрысціянскай царкве: "Ты ёсць Пётр і на гэтай апоры збудуеш касцёл мой" [3, с. 5]. Значыць менавіта святы Пётр з'яўляецца намеснікам Хрыста на зямлі, ён ёсць стваральнік царквы Божай, а праз яго як спадкаемца рымскага патрыярха атрымлівае ўладу Папа Рымскі. Пры гэтым

[1] Пераклад цытат з польскай мовы наш – *Д. С.*

улада ёсць неад’емнай часткай, апірышчам і апорай на якой будуецца царква. Касцёл як аб’яднанне хрысціян фундуецца не агулам цікаўнасцей, а кампетэнцыяй, якую надаў Хрыстос святому Пятру, праз якога атрымаў падобную кампетэнцыю Папа Рымскі. Менавіта праз гэты аргумент паўстае контраргумент А. Пікарскага да закіду ў фармальнасці ўлады пантыфіка, якую выказаў І. Галятоўскі. З пункту гледжання каталіцтва ўлада даецца не з нагоды сталіцы Рымскай, а з нагоды сталіцы Пятровай.

Пытанне рэлігійнай іерархіі наследуе пытанне іерархічнасці ўлады сярод апосталаў. Калі рымскі касцёл ясна сцвярджае, што ўлада належыць святому Пятру, ён старшынствуе ў царкве, а значыць і сярод апосталаў, то для праваслаўных на старшынства апосталаў існуе зусім іншы пагляд. Іанікій Галятоўскі падае наступную аргументацыю. Па-першае, трэба разрозніваць паняткі: ёсць Пётр сам па сабе як чалавек, а ёсць яго вера. У такім выпадку: “Не на Пятры то, не на чалавеку абяцаў пан Хрыстос будаваць царкву, але на веры Пятровай” [3, с. 5]. У сваю чаргу, у гэтай веры ёсць сімвал, які выражаецца ў словах: “Ты ёсць Хрыстос сын Бога жывога” [3, с. 5]. Так як гэтыя словы павінен падзяляць любы хрысціянін, то, значыць, Пётр менавіта гэткім любым хрысціянінам і з’яўляецца. Галятоўскі падае словы Пятра: “Да каго далучацца, ці да камення жывога, ці да людзей аб’яднаных, але толькі да Бога абранага і вечнага. І самі як жывое каменне будуйце дом Духоўны” [3, с. 5]. Адсюль любыя кампетэнцыі сыходзяць выключна ад Бога. Бог ёсць і духоўная, і фармальная дамінанта стварэння рэлігійнай супольнасці, і ў гэтым выпадку для стварэння супольнасці не маюць першаснага значэння кампетэнцыі, атрыманыя з гэтага свету.

З прапанаванай хады аргументацыі вынікае яшчэ адно адрозненне ў інтэрпрэтацыі паміж дзвюма канфесіямі: рымскі касцёл надае большую істотнасць фармальным канструкцыям, рэалізаваным у рэчаіснасці, як то іерархія, рэпрэзентаваная ўлада; праваслаўе, у сваю чаргу, схіляецца ў бок унутранага свету, унутранай веры, якая патрабуе менш фармальных атрыбутаў. У гэтым рэчышчы больш зразумелай выглядае інтэрпрэтацыя А. Пікарскага слоў Хрыста да Пятра: “Табе дам ключы каралеўства нябеснага/што абвясціш на зямлі/ то будзе і на Небе” [3, с. 5]. Для А. Пікарскага – пытанне кампетэнцыі гэта пытанне іерархіі, уладнага права рэпрэзентацыі, пасольства свету нябеснага на зямлі, якое мае права нават на большае, сцвярджаць на зямлі законы, якія маюць сілу і на небе. Каталіцтва пастуліруе не аднабаковы вектар кампетэнцыі, які сыходзіць з таго свету і скіраваны на гэты, але двухбаковасць стасункаў. Менавіта дзякуючы гэткай двухбаковасці, істотнага ўзроўню самастойнасці Папы Рымскага ад Бога выкрышталізоўваецца разуменне дамінантнасці ўлады, атрыманай у спадчыну ад святога Пятра. Для А. Пікарскага Пётр – гэта absalutus dominus (Абсалютнае першынство).

Для І. Галятоўскага словы Хрыста маюць выключна іншае значэнне. Для праваслаўя ключы ад царства нябеснага ёсць моц адпушчэння грахоў, якую маюць усе епіскапы. Пётр не ёсць absalutus dominus, ён раўнапраўны сярод апосталаў, дзе былі яшчэ Павел, Якуб, Пётр, якіх называлі слупамі веры [3, с. 5 – 6]. У сваю чаргу, моц адпушчэння грахоў і ёсць той акалічнасцю, якая тлумачыць, што менавіта зробленае на зямлі набывае моц на небе. Уласна ў гэтай інтэрпрэтацыі хаваецца кампетэнцыя святарства як інстытута, і гэтая кампетэнцыя ўсё адно мае аднабаковы вектар скіраваны са свету нябеснага.

Тонкая інтэрпрэтацыя падзелу на духоўнае і фармальнае жыццё царквы не аспрэчваецца ні касцёлам, ні праваслаўем, пры гэтым фармальная частка з’яўляецца істотным аргументам. Так, А. Пікарскі ўпікае І. Галятоўскага, што Хрыстос галава духоўны, а павінен быць рэальны галава, які вырашае надзённыя праблемы царквы. І ў гэтым сэнсе ўся хрысціянская супольнасць будзе без галавы, калі адрынуць уладу Папы Рымскага і Пятра, бо каталіцтва ясна адасабляе духоўны свет ад матэрыяльнага. Менавіта праз падобнае разуменне легітыміруюцца А. Пікарскім кампетэнцыі гэтага свету. Адсюль вынікае, што заявы І. Галятоўскага аб уладзе над царквой Хрыста ў гэтым свеце выглядаюць нерэлевантна. Пры тым істотна, што тэза пра старшынства Хрыста ў сусветнай царкве не аспрэчваецца.

Контраргумент І. Галятоўскага заключаецца ў канечнасці Папы як чалавека. Калі боскі і чалавечы пачаткі ў Хрыстосе неадасабляемыя, то Папа Рымскі з’яўляецца ў першую чаргу чалавекам, які мае свой век. У гэтым сэнсе смерць пантыфіка ёсць прыпыненне кампетэнцыі яго як духоўнай асобы, а новыя кампетэнцыі надаюцца сінодам. Таму калі паміраюць папы рымскія, то касцёл можа існаваць колькі год, месяцаў ці тыдняў без яго ўлады [3, с. 8]. У сваю чаргу, калі пантыфік абіраецца кардыналамі, а таксама кіруе царквой у іншых краінах праз кардыналаў, якія ёсць намеснікамі намесніка, то патрыярхі ёсць намеснікамі Хрыста і кіруюць на месцах, і падначалены Хрыстосу, а не Папе.

Пытанне кіравання падымае пытанне пражывання ў канкрэтнай краіне. Для каталіцкай царквы істотна, каб Папа жыў асобна, у незалежнай краіне, так як ён прызначае намеснікаў і з’яўляецца суверэнам. З каталіцкага пункта погляду суверэн не можа жыць там, дзе ён сам знаходзіцца пад уладай іншага манарха.

У сваю чаргу, для праваслаўя пытанне пражывання патрыярхаў не так істотна, так як іх галава Хрыстос, і рэпрэзентацыя, іх кампетэнцыя сыходзяць з унутранага свету веры, а не фармальнага – улады. Канцлер, які прысутнічае на дыспуце заўважае, што патрыярхі ўсходняй царквы жывуць у мусульман-

скіх краінах. Дадзеная тэза з'яўляецца гістарычным абвінавачваннем праваслаўя каталіцкім бокам, а таксама з'яўлялася нагодай для падобных абвінавачванняў з боку дзяржавы. Менавіта ў здрадзе дзяржаўным інтарэсам былі абвінавачаны новапаўсталыя праваслаўныя іерархі, калі ў 1620 годзе іерусалімскі епіскап Тэафан, надзелены правам прысвячэння ў рэлігійныя саны Канстанцінопальскім патрыярхам, таемна аднавіў праваслаўную іерархію ў тагачаснай Беларусі. Сам епіскап быў названы Турэцкім шпікам (бо і Іерусалім, і Канстанцінопаль знаходзіліся на тэрыторыі Турэцкай дзяржавы), а новыя іерархі – аб'ектамі ўплыву Турэцкага цара [5, с. 283]

Галятоўскі парыруе "Папы Рымскія калісьці жылі пад уладай паганцаў... Готаў і Вандалаў няверных" [3, с. 8]. З праваслаўнага пункту гледжання сюзерэнітэт Папы Рымскага з'яўляецца гістарычным, а значыць не можа быць рэлігійнай канстантай. У сваю чаргу, вера ў Хрыста безумоўна такой з'яўляецца. Калі Хрыстос, а не Папа кіруе патрыярхамі, то менавіта ён пастыр над апосталамі і патрыярхамі. Адсюль вынікае контраргумент да закіду ў раздробленасці праваслаўных цэркваў. Усходняя царква адзіна, бо Хрыстос яе галава. Іншымі словамі, для ўсходняй царквы пытанне раздробленасці хрысціянства ўвогуле не ўздымаецца, бо не можа быць раздробленай супольнасці, на думку праваслаўя, дзе ёсць адзін кіраўнік.

Галятоўскі з нагоды Папы Рымскага кажа: "Калі адно цела мае дзве галавы, то з'яўляецца монстрам, так і царква, калі мае дзве галавы Хрыстоса і папы". Іншымі словамі, для праваслаўя ў каталіцтве ёсць два ўладных цэнтры: Хрыстос і Папа Рымскі. Дадзены пункт гледжання не супярэчыць паглядам каталіцтва, бо для каталіцтва пантыфік безумоўна з'яўляецца манархам. Тым не менш раз'яднанасць праваслаўных цэркваў у вачах каталіцтва набывае тую ж актуальнасць, як і падзел улады Хрыста і Папы Рымскага. Пікарскі ўпікае Галятоўскага, што пантыфік адзін і адна царква пад яго пачаткам, у той час як праваслаўных цэркваў чатыры і чатыры патрыярхі выглядаюць больш вялікім монстрам у пытаннях кіравання царквой [3, с. 9].

Інтэрпрэтацыя заўсёды сягае далей за базавыя пастулаты, набывае першасную вартасць, дае зразумець у канкрэтных жыццёвых каардынатах, што з'яўляецца монстрам, а што не. Як для каталіцкага касцёла, так і для праваслаўных цэркваў пытанне адзінаўладдзя не з'яўляецца пытаннем веры. Пікарскі пытаецца ў Галятоўскага, якія існуюць формы ўлады і Галятоўскі адказвае ў духу Арыстоцеля: манархія, арыстакратыя і дэмакратыя [3, с. 17]. Як для А. Пікарскага, так і для І. Галятоўскага сістэма царквы – гэта манархічная сістэма; як для А. Пікарскага, так і для І. Галятоўскага манархам з'яўляецца Хрыстос. Менавіта таму, для праваслаўя чатыры патрыярхі цалкам – спрыяльная сітуацыя, так як улада ідзе не ад апосталаў, а ад Хрыста, у той час як для каталіцкага касцёла Хрыстос ёсць духоўны галава, а пантыфік – манарх царквы, фармальная структура рэпрэзентацыі Бога.

Інтэрпрэтацыя ўладных дачыненняў паміж апосталамі і адпаведна паміж патрыярхамі эксплікуе адрозненні між канфесіямі ў паглядзе на ўладкаванне дзяржавы. Калі каталіцкі пагляд відавочна імперскі: "Апостальская сталіца ў Рыме таму папа рымскі ёсць галава царквы і над патрыярхамі вашымі" [3, с. 16], то праваслаўе займае дэцэнтралізацыйныя пазіцыі. Як сцвярджае І. Галятоўскі, калі Хрыстос не зрабіў манархам Пятра над апосталамі, чаму Папа Рымскі над царквой усёй быць павінен? Ён галава сваёй дыецэзіі, як патрыярхі Канстанцінопальскі, Александрыйскі, Анціахійскі і Іерусалімскі ў сваіх. Больш за тое, апостал Пётр як галава Рымскай дыецэзіі праз свой апостальскі статус не з'яўляецца ўнікальным, "Бо ў Канстанцінопалі патрыярхам быў першым апостал Андрэй, у Александрыі – апостал Евангеліст Мацей, у Анціахіі – апостал Пётр, які потым быў патрыярхам у Рыме. У Іерусаліме патрыярхам быў апостал Якуб" [3, с. 16]. У сваю чаргу, падобная адасобленасць цэркваў цалкам легітыміраваная калектыўнай кампетэнцыяй сінодаў, дзе збіраюцца кіраўнікі ўсіх цэркваў.

Каталіцтва надае асаблівую вартасць адзінаўладдзю, бо Хрыстос ёсць адзін уладар, і яго рэпрэзентацыя павінна мець усю ўладу над царквой. Між тым праваслаўе, у асобе І. Галятоўскага, акцэнтуе ўвагу на сінадальнасці. Менавіта на сінодах, калегіяльна прымаюцца найбольш адказныя рашэнні, бо Хрыстос на небе, а тут толькі яго намеснікі.

Пытанне намеснікаў Хрыста таксама ўпіраецца ў пытанне кампетэнцыі. Пікарскі прамаўляе: "Якуб сталіцу ў Іерусаліме атрымаў, але Пётр усяго свету" [3, с. 4]. Адсюль юрысдыкцыя патрыярхаў сягае не далей за іх дыецэзію, у сваю чаргу Рымскі першасвятар як спадкаемца Пятровай улады мае сусветную дыецэзію. "Нельга раўняць апостала Якуба і апостала Пятра. Але мусіш яго вышэйшым прызнаць і прызнаць, што ён падначалены Пятру заставаўся [3, с. 4]", таксама як іншыя апосталы падначалены Пятру, так і патрыярхі падначалены Папе Рымскаму.

Праблемнае поле палемікі вакол рэлігійнай іерархіі апынаецца прынцыповым не толькі ў галіне арганізацыі царквы, але і веравучэння. Калі веравучэнне сцвярджае, што іерархія павінна быць выбудавана ад аднаго ўладнага цэнтра, то іншыя рэлігійныя арганізацыі, дзе падобнага цэнтра няма, альбо ўся іерархія знаходзіцца па-за законам і ёсць толькі асобныя святары, з'яўляецца, такім чынам, нелегітымнай

і з духоўнага гледзішча. Тады фармальныя структуры, як то іерархія робяцца асноўнымі элементамі веравучэння, якія маркіруюць кропкі адрозненняў паміж канфесіямі, а рэлігійная інтэрпрэтацыя робіцца асноўным інструментам такога маркіравання.

Фармальныя структуры пранікаюць у веравучэнне, а веравучэнне ў фармальныя структуры. Гэты амбівалентны працэс робіцца часткай веры, з яе бяруць аргументацыю і натхненне палемісты. На закіды А. Пікарскага, што Папа ёсць манархам над царквой, І. Галятоўскі ўпікае каталіцтва не толькі ў заганнасці такога погляду ў фармальным ключы, але ў першую чаргу ў ключы веры: “Як гневаўся Бог на ізраільцянаў, што яны адрынуўшы Бога, караля свайго, чалавека сабе абралі за караля і гаспадара, так і на рымлянаў гневаўся Бог, што адрынуўшы Хрыста Бога, караля і гаспадара, абралі сабе папу, чалавека канечнага за гаспадара і за манарха” [3, с. 16]. Адсюль для праваслаўя рэпрэзентацыя можа існаваць толькі да таго часу, пакуль не пачынае падмяняць рэпрэзентаваную структуру. Розніца паміж каталіцкім і праваслаўным падыходам з колькаснай (да якой ступені Папа толькі намеснік Хрыста і ў якой ступені Папа кампетэнтная адзінка сам па сабе) пераходзіць у якасную (Папа як манарх, якога абралі замест Бога, як вяртанне сюжэта пра Ізраільцян, якія папрасілі Бога прызначыць ім кіраўніка над імі).

Вынікам дыспуту А. Пікарскага і І. Галятоўскага з неабходнасцю з’яўляюцца ўмовы і асаблівасці замірэння і аб’яднання хрысціянскіх цэркваў тагачаснай Беларусі. Пытанне існавання разнастайных дэнамінацый у Хрысціянстве – гэта таксама пытанне рэлігійнай інтэрпрэтацыі. Разнастайнасць дэнамінацый можа існаваць толькі ў рэчышчы дыспуту аб аб’яднанні хрысціянскіх канфесій. Пераадоленне рэлігійнага расколу змяшчаецца ў замірэнні паміж разнастайнымі інтэрпрэтацыямі хрысціянскага вучэння. Менавіта таму для І. Галятоўскага пытанне рэлігійнага замірэння – гэта пытанне суіснавання розных канфесій, а не ўз’яднання адной падзеленай рэлігійнай структуры, як прапаноўвае А. Пікарскі. Наступныя аргументы як мага лепей пацвярджаюць гэтую тэзу.

Пікарскі заяўляе: “Але ж вы з намі агульную царкву павінны мець, бо Хрыстос казаў: “Будзе адна аўчарня і адзін пастар” [3, с. 18]. Дадзеная тэза ёсць пралогам да больш істотнага аргумента, які тычыцца ўз’яднання хрысціянскіх цэркваў на Фларэнтыйскім саборы: “На Фларэнтыйскім саборы ваш мітрапаліт Кіеўскі ўніяю з касцёлам рымскім прыняў” [3, с. 18]. І сапраўды, на Фларэнтыйскім саборы былі падпісаны істотныя экуменічныя дакументы, былі развязаны рэлігійныя пытанні і прыняты за неістотныя дагматычныя супярэчнасці. У сваю чаргу, Фларэнтыйскі сабор меў даволі цьмяныя наступствы, бо далей за падпісанне дакументаў справа не пайшла. Галятоўскі прамаўляе: “Ісідар, мітрапаліт Кіеўскі, але па вяртанні не прынялі ні яго, ні ягоную ўнію” [3, с. 18]. Сітуацыя з Берасцейскай уніяй набывае акурат падобныя канатацыі, таму пытанне ўз’яднання цэркваў, гэта пытанне не сабораў, дзе разбіраюцца рэлігійныя дагматы, а пытанне мірнага суіснавання разнастайных канфесій.

Прымаючы пад увагу ўсё пералічанае можна зрабіць шэраг высноў адносна месца і ролі праваслаўна-каталіцкай палемікі ў духоўным і рэлігійным жыцці Беларусі XVII стагоддзя. Варта сказаць, што праз рэлігійную палеміку адбывалася фармалізацыя канфесіяў. Менавіта ў палеміцы вынаходзяцца падабенства і адрозненні паміж канфесіямі, канфесіі бліжэй знаёмяцца адна з адной, пачынаюць разумець рэлігійную аргументацыю і крыніцы кампетэнцыі свае і чужыя. Праз палеміку адбываецца фіксацыя, маркіраванне адрозненняў, а праз адрозненні, іх інтэрпрэтацыю выкрышталізоўваецца канфесія з неаднароднай хрысціянскай супольнасці шляхам засваення згаданых інтэрпрэтацый у веравучэнне.

Па-другое, праз палеміку, праз узаемныя прэтэнзіі і контраргументы выбудоўваецца структура дыялогу паміж канфесіямі. Вызначэнне адрозненняў адбываецца праз камунікацыю і магло адбыцца толькі ў адным культурным камунікацыйным полі. Дыскусія адбывалася ў адным культурным асяродку, бакі разумелі свае і чужыя кампетэнцыі, ходу аргументацыі і выкарыстоўвалі блізкія аргументы. Іншымі словамі, рэлігійная палеміка была своеасаблівым камунікацыйным фактарам не толькі канфесіяналізацыі, але і ўзаемаіснавання канфесій на адной тэрыторыі. Як ужо было сказана вышэй, дзякуючы гэтай камунікацыі фарміравалася не толькі выбудова сябе, але і выбудова іншага ў светапоглядзе праваслаўя і каталіцтва.

Па-трэцяе, праваслаўна-каталіцкая палеміка, нягледзячы на тое, што спрыяла разрозненню дзвюх хрысціянскіх канфесій, але адбывалася ў экуменічным рэчышчы. Аб’яднанне хрысціянскіх цэркваў было базісам і глебай рэлігійнай палемікі на тэрыторыі тагачаснай Беларусі. Менавіта дыспут аб формах і метадах суіснавання розных рэлігійных арганізацый у межах агульнай хрысціянскай супольнасці стаў тым урадлівым полем, якое не проста спрыяла дыялогу паміж дзвюма канфесіямі, але і наўпрост прымушала ўступаць у камунікацыю супрацьлеглыя бакі.

ЛІТАРАТУРА

1. Bibliografia Literatury Polskiej – Nowy Korbut. T. 3: Piśmiennictwo Staropolskie. – Warszawa: Pąństwowy Instytut Wydawniczy, 1965. – 586 s.

2. Chodynicki, K. Kosciol prawoslawny a Rzeczpospolita Polska. Zarys historyczny 1370 – 1632 / K. Chodynicki. – Warszawa, 1934 Orthdruk 2005. – 610 s.
3. Galatowski, J. Rozmowa Białocerkiewska. Wielebnego Oyca Ioaniciusza Galatowskiego Ordinis S. Basilii Magni, Rectora Kiiowskiego z Wielebnym Xiędzem Hadrianem Piekarskim Societatis Iezu Kaznodźieią Iego K. Mśći. De hierarchia Ecclesiae. v Naywyższego Kanclerza Koronnego w Gospodźie miana. y od niektorych z Rycerstwa Katholickiey Wiary z pilnośćią tam sluchana y notowana, potym zaś porządnie przepisana y wydrukowana / J. Galatowski. – Kijow, 1663. – 19 s.
4. Krowicki, M. Apologia więtsza, to iest: obrona nauki prawdziwey / M. Krowicki. – Wilno. 1604. – 288 s.
5. Verificatia niewinniści: Y omylnych po wazytkiey Litwie y Białey Rusi rozsianych, żywot y uczciwe cnego Narodu Ruskiego o upad przyptawić zrządzonych nowin, pod miłościwą Pańską y Oycowską nawyższey y pierwszey po Panu Bodu narodu tego zacnego zwierzchności, y brzegu wszelkiey sptrawiedliwości obronę, poddane chrześcianskie uprzątnienie // Архив Юго-Западной России: в 2 ч. – Кіев, 1887. – Ч. 1. Т. 7. – С. 279 – 344.
6. Галятовский, И. Скарбница потребная и пожитечная всему свету / И. Галятовский. – Новгород-Северский, 1676. – 28 л.
7. Плохій, С. Наливайкова віра: Козаки та релігія ранньомодерній Украіне: пер. з англ. / С. Плохій. – Киев, 2005. – 496 с.
8. Яскевіч, А. Іанікій Галятоўскі / А. Яскевіч // Старажытная беларуская літаратура (XII – XVII стст.) / уклад, прадм., камент. І. Саверчанкі. – Мінск: Кнігазбор, 2007. – 608 с.

*Паступіў 01.11.2013*

**THE SENSE OF THE HIERARCHIC ISSUE IN XVII CENTURY IN ORTHODOX AND CATHOLICS POLEMIC ON EXAMPLE OF IOANNIKIJ GALATOWSKI AND ADRIAN PIKARSKI DEBATES “ROZMOWA BIAŁOCERKIEWSKA»**

***D. SMALIAKOU***

*The article deals with debates between Ianikij Galatowski and Adrian Pikarski. It proposes the understanding of connotations connected with debates on hierarchy in Orthodox and Catholics polemic in XVII cent. Belarus. The article analyzes the arguments of each side, the place and role of the arguments in historical background of Belarus. The article investigates the question of Pope of Rome priority in Christian community as a key moment of religious polemics between Catholics and Orthodox. The article explains the place of the arguments in religious and spiritual live of XVII cent. Belarus. The article proposes the view on religion polemics as part of the dialogue around the process of Christian churches unification.*